*В.А. КАХНОВІЧ*

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ДВАРАНСКАГА ПРАМЫСЛОВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА НА ПАЛЕССІ Ў ПАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД (1861–1914 гг.) І НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ЯГО ВЫВУЧЭННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

На основании материалов фабричной статистики прослеживаются и анализируются особенности развития помещичьего предпринимательства на территории Полесья, а также проблемы дворянского промышленного предпринимательства в рамках белорусской и украинской историографии.

On the basis of factory statistics the peculiarities of the development of landowner business in Polessie region are investigated and analyzed. The problems of nobility industrial business within the framework of the Belorussian and the Ukrainian historiography are also considered.

Сучаснасць прыцягвае ўвагу да праблемы прадпрымальнасці і ініцыятыўнасці асобы. Нам падаецца зручным асвятліць частку дадзенай праблемы на прыкладзе гісторыі развіцця дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва другой паловы XIX – пачатку XX ст. на Палессі, звяртаючыся да матэрыялаў фабрычна-заводскай статыстыкі таго часу[1]. Агульную асаблівасць перыяду і фон развіцця прадпрымальніцтва, як бачыцца, добра заўважыў сучаснік падзей – эканаміст А.У. Пешахонаў: «Сельскохозяйственные экономии с техническими производствами процветают, пользующиеся промысловыми заработками крестьянские дворы живут еще сносно, а чисто земледельческие хозяйства и местности неизменно почти пребывают в угнетенном состоянии»[2].

Складанасць, якую адзначалі яшчэ З.Е. Абезгауз і М.Ф. Болбас, стварае тое, што шэраг прадпрыемстваў у гэтых матэрыялах прапушчаны. Напрыклад, не згадваюцца рамонтныя майстэрні Палескіх чыгунак у Пінску, майстэрні Лібава-Роменскай чыгункі ў Гомелі, цукроварафінадны завод у Чарнігаве, запалкавая фабрыка Іосіфа Аб-

рамавіча Гальперына («Прагрэс-Вулкан») у Пінску і інш. Больш дакладна адлюстроўвае сітуацыю «Список фабрик и заводов России 1910 г.». Адзначым, што некаторыя прадпрыемствы і тут прапушчаны (цагельны завод у Брэсце, чыгуначныя майстэрні ў Гомелі). Але ў адрозненне ад папярэдніх матэрыялаў спіс 1910 г. мае шэраг недахопаў уліку. М.Ф. Болбас адзначаў, што ўлічана ў спісах і паказальніках прадпрыемстваў меней, чым іх было на самай справе, бо не ўлічваліся ўсе тыя, што існавалі ў прамежкавыя да часу іх выдання гады[3]. Вынікае, што колькасць рабочых і аб'ёмы вытворчасці заніжаныя і толькі ацэначныя.

Аўтарам на падставе наяўных звестак была складзена база дадзеных на 1895 і 1910 гг. па рэгіёну Палесся: Холмскі і Грубешоўскі паветы Люблінскай губерні; Бяльскі, Уладаўскі і Канстанцінаўскі – Седлецкай; Бельскі, Пружанскі, Брэсцкі і Кобрынскі – Гродзенскай; Мазырскі, Рэчыцкі і Пінскі – Мінскай; Чарнігаўскі і Гараднянскі – Чарнігаўскай; Радамысельскі – Кіеўскай; Жытомірскі, Ноўгарад-Валынскі, Уладзімір-Валынскі, Ковенскі, Оўручскі, Ровенскі і Луцкі – Валынскай. Асобна пералічваліся да 15 груп вытворчасці з улікам колькасці прадпрыемстваў, рабочых, аб'ёмаў вытворчасці (у тыс. руб.). Дадзеныя былі інтэграваны ў агульную табліцу, у якой пададзены ўсе прыведзеныя ў крыніцах дваранскія прадпрыемствы – без вычлянення фабрык, заводаў і мануфактур.

Як відаць, лік прадпрыемстваў у 1910 г. паказаны меншы, чым у 1895 г. (278 супроць 316), але гэта без уліку млыноў і крупадзёрак, бо вызначыць сярод іх дваранскае паходжанне ўладальнікаў на 1910 г. крыніца не дазваляе. Агульны лік такога роду аб'ектаў – 212 у 1910 г. супроць 52 у 1895 г. Дадзеныя на 1895 г. паказваюць долю дваранскіх прадпрыемстваў у 38,5 % па галіне. Але можна заўважыць, што, напрыклад, ва Уладаўскім павеце і г. Уладава налічвалася 5 млыноў, з якіх 4 былі дваранскімі, у тым ліку графу Густаву Замойскаму належала 3[4]. На ўсходзе ж – у Гомельскім павеце і г. Гомелі – з 6 крупадзёрак ніводная дваранам не належала[5]. Ацэначна, з 1895 па 1910 г. дваранская прысутнасць у мукамольна-крупяной галіне (надзвычай прыбытковай на той час) знізілася і наўрад ці складала 1/4 прадпрыемстваў.

Бачна, што лік дваранскіх прадпрыемстваў на Палессі, нават без уліку мукамольнай галіны, скараціўся з 296 да 278, ці на 9,4 %, затое аб'ём вытворчасці ўзрос у 2,7 разы, а колькасць рабочых – у 1,5 разы (табліца). Дваранскія прадпрыемствы сталі больш буйнымі: сярэдні лік рабочых на іх узрос з 31 да 52 чал. Аднак усё гэта адлюстроўвае толькі агульную тэндэнцыю: побач з такімі гігантамі, як Добрушская папяровая фабрыка князя Івана Фёдаравіча Паскевіча (392 рабочыя ў 1894 г. і 1269 у 1910 г.), Чэрвонскі цукровы завод Фёдара Арцем'евіча Цярэшчанкі ў Жытомірскім павеце (815 і 710 рабочых адпаведна)[6], было мноства дробных дваранскіх вінакурань, дзе лік рабочых у адносна невялікай колькасці выпадкаў (16 % на 1910 г.) перавышаў 10 чал.

Што датычыць вінакурэння, то значэнне гэтай галіны ў структуры дваранскай прамысловасці ўзрасло: колькасць прадпрыемстваў павялічылася ў 1,25 разы, вытворчасць – у 6 разоў, рабочых жа – у 1,4 разы. Заўважым, што паказальнікі за 1894–1895 гг. даюць звесткі аб аб'ёме вытворчасці вінакурань толькі ў вёдрах спірту, а за 1910 г. – па 65 вінакурнях (у тым ліку 17 па Рэчыцкаму павету Мінскай губерні) было магчымым скласці выбарку паказчыкаў аб'ёмаў вытворчасці ў вёдрах спірту і рублях (сярэднія паказчыкі – 2,2 руб. за 1 вядро спірту). Атрыманыя лічбы сталіся блізкімі да тых, што знаходзім у В.П. Панюціча, але датычна 1860-х гг.[7] У цэлым, аднак, вінакурэнне займала толькі 2-ю пазіцыю, саступаючы на 1895 г. па аб'ёму вытворчасці і ліку рабочых цукровай вытворчасці. Менавіта гэтыя дзве галіны (цукровая і вінакурэнне) ведалі павелічэнне ліку прадпрыемстваў. Можна заўважыць, што цукраварства пакрысе ў пачатку XX ст. пачало здаваць пазіцыі, аднак і вінакурэнне стала дамінуючай галіной толькі ў канцы разглядаемага перыяду.

**Дваранская прамысловасць на Палессі (1895–1910 гг.)**

| Група вытворчасці | 1895 г. | | | 1910 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Прадпрыемствы | Вытворчасць, тыс. руб. | Рабочых, чал. | Прадпрыемствы | Вытворчасць, тыс. руб. | Рабочых, чал. |
| Лёгкая прамысловасць | 3 | 183 | 357 | 1 | 110,5 | 236 |
| Лясная галіна | 46 | 2061 | 1689 | 31 | 4012,3 | 2788 |
| Фаянсавая, фарфоравая | 5 | 173 | 310 | 4 | 547,3 | 1183 |
| Металургія і машынабудаванне | 2 | 12 | 31 | 1 | 20 | 44 |
| Гарбарная | 4 | 31 | 39 | 0 | 0 | 0 |
| Мукамольная і крупяная | 20 | 537 | 96 | ? | – | – |
| Вінакурэнне | 164 | 2299,5 | 1475 | 206 | 14013,34 | 2056 |
| Цукровая | 6 | 6455 | 4464 | 14 | 12929,2 | 6257 |
| Маслабойная (экстракцыйная і змешаная) | 3 | 13 | 7 | 0 | 0 | 0 |
| Піва-мёдаварная | 11 | 88 | 44 | 3 | 56 | 22 |
| Крухмальная і да т. п. | 2 | 12 | 29 | 6 | 122,4 | 66 |
| Тлушчавая | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| Цагельная, будаўнічых матэрыялаў | 22 | 297 | 448 | 2 | 15,8 | 50 |
| Шкляная | 25 | 241 | 692 | 9 | 1405,3 | 1616 |
| Тытунёвая | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| Іншыя | 3 | 23 | 56 | 0 | 0 | 0 |
| Усяго | 316 | 12 425,5 | 9755 | 278 | 33 232,14 | 14 318 |

Заўважана, што буйнейшыя ў краі цукровыя заводы належалі амаль выключна дваранам (Ф.А. Цярэшчанку, М.А. Цярэшчанку, І.Я. Будназму, графу І.А. Патоцкаму). Усе яны размяшчаліся на паўднёвай ускраіне паветаў Палесся: у 1910 г. 4 – у Жытомірскім павеце, 2 – у Ровенскім, 1 – у Ноўгарад-Валынскім, а таксама 2 – у Чарнігаўскім, 3 – у Грубешоўскім, 2 – у Холмскім. Прыналежнасць гэтых прадпрыемстваў да праяў рэгіянальнай спецыфікі Палесся сумніўная. Таму можна лічыць, што не гэтыя (найбуйнейшы на Палессі Заказеліцкі спіртавы завод графіні Н.А. Бабрынскай у Кобрынскім павеце налічваў усяго 26 рабочых пры 66,3 тыс. руб. валавога гадавога даходу), а іншыя буйнейшыя прадпрыемствы вызначалі спецыфічны воблік прамысловасці ў краі. Тое была лясная галіна: згаданая вышэй Добрушская фабрыка Паскевіча (3-я ў рэгіёне па аб'ёму вытворчасці на 1910 г. пасля 2 цукровых заводаў і 1-я па колькасці рабочых), Капцэвіцкі лесапільна-фанерны завод Кяневічаў у Мазырскім павеце і інш. Аднак, як можна заўважыць (гл. табліцу), названая галіна, як і ўсе іншыя, апрача вінакурэння і цукровай вытворчасці, зазнавала стагнацыю (на агульным фоне прамысловасці ў краі). Гэта «прыродная галіна» для ўмоў краю, аднак нідзе так, як у ёй, не праявіў сябе недваранскі буржуазны элемент: буйнейшыя запалкавыя фабрыкі Іосіфа Гальперына ў Пінску, таварыства «Маланка» ў Мазыры, дрэваапрацоўчы завод Магіса і Юніса ў Рэчыцы і г. д. Паказальна, што найбольш прыбытковым прадпрыемствам на Палессі на 1895 г. быў стэарынавы завод у маёнтку Альбрэхтова таварыства «Эліосберг, Рабіновіч і К°». З.Е. Абезгауз называў яго адным з лепшых прадпрыемстваў Расіі[8]. Яно налічвала 70 рабочых і вырабляла 190 тыс. свечак у год, зарабляючы 1,15 млн руб., у той жа час цукровы завод Ф.А. Цярэшчанкі ў Жытомірскім павеце пры 815 рабочых, 17 паравых машынах меў гадавы даход у 1 млн руб.[9] У 1910 г. прадпрыемства ўжо не існавала. Таксама з 3 прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, што належалі дваранам на 1895 г., у 1910 г. засталася толькі адна суконная фабрыка А.А. Скірмунта ў Парэччы (Пінскі павет).

Трэба згадаць шкляную і фарфора-фаянсавую галіны. Гуты і фарфора-фаянсавыя прадпрыемствы былі пашыраны на Валыні, найперш у Жытомірскім і Ноўгарад-Валынскім паветах. Звычайна гэта былі сярэднія па памерах прадпрыемствы, дастаткова на 1895 г. прыбытковыя. Стваралі іх пераважна мясцовыя памешчыкі: Іван Кандратовіч, граф Альфрэд Патоцкі, Іван Плачкоўскі, Людгарда Ябланоўская і інш. Буйнейшая тады ў краі гута (82 рабочыя, вырабляла шкла на 49 тыс. руб.) належала Фердынанду Радзівілу ў маёнтку Багуслаўка Луцкага павета. Вылучаліся таксама фаянсавыя заводы Алтэі Феншау ў маёнтку Паканева Бельскага павета і Івана Каншына ў Брэсцкім павеце, 2 шкляныя заводы Францыска Пуслаўскага ў м. Целяханы Пінскага павета[10]. Аднак ужо тады да паловы прадпрыемстваў шкляной і фарфора-фаянсавай вытворчасці здаваліся ў арэнду Абелю Зусьману, Арону Вайсбергу і іншым яўрэйскім прадпрымальнікам. Да 1910 г. роля апошніх вырасла да дамінуючай у галіне, а палова дваранскіх прадпрыемстваў знікла.

Падсумоўваючы назіранні, можна канстатаваць, што дваранская прамысловая актыўнасць мела дамінуючую і ўзрастаючую па тэмпах развіцця вінакурную скіраванасць. У іншых жа галінах яна цярпела стагнацыю, замаруджванне тэмпаў развіцця і нават спад. Працэсы гэтыя адпавядалі паскарэнню ў развіцці краю, выкліканым у 1880-я гг. будаўніцтвам чыгунак і меліярацыяй. Рынак перастаў быць лакальным, і прыток больш канкурэнтаздольных тавараў з іншых рэгіёнаў выціскаў досыць слабых мясцовых прадпрымальнікаў з шэрага сфер эканамічнай актыўнасці. Аднак у цэлым не варта недаўлічваць ролю дваранскай прамысловасці: у 1895 г. з 316 дваранскіх прадпрыемстваў 304 месціліся ў павеце (96,2 %) і складалі 50,8 % ад усіх 621 у краі, 70 % усёй вытворчасці (17,3 млн руб.) і 69,7 % усіх рабочых (14 002). У 1910 г. 278 дваранскіх прадпрыемстваў склалі 46,25 % ад 601 у краі, або 58,8 % ад усяго аб'ёму вытворчасці (56,63 млн руб.) і 43,8 % ад усіх рабочых (32 728). Бачна, што дваранства захоўвала вядучыя пазіцыі ў краі і напярэдадні Першай сусветнай вайны, але імкліва страчвала іх (за 15 гадоў на 1/3).

Разам з тым узнікае неабходнасць у выяўленні месца дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва ў рэгіёне Палесся ў беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Апошняе цалкам заканамерна вынікае з тэрытарыяльнай прыналежнасці краю.

Праблемы развіцця памешчыцкай гаспадаркі закраналіся ў межах беларускай гістарыяграфіі ў працах К.І. Кернажыцкага, М.В. Доўнар-Запольскага, Д.А. Дудкова, В.А. Шчарбакова, М.Б. Фрыдман, Л.П. Ліпінскага, К.І. Шабуні, С.М. Самбук, В.П. Панюціча, Х.Ю. Бейлькіна, А.П. Жытко, В.М. Бусько, А.Г. Каханоўскага, У.С. Пуціка і інш. Але дамінуючай у гістарыяграфіі заўсёды выяўляла сябе праблематыка сялянскага гаспадарання ў самых розных аспектах. Звяртаючыся ж да гістарыяграфіі прамысловага развіцця, адзначым, напрыклад, што З.Е. Абезгауз закранае развіццё прамысловасці ў цэлым, але дваранскую прамысловасць не разглядае асобна[11]. М.Ф. Болбас жа вылучае яе рэгіянальныя асаблівасці (канцэнтрацыя вінакурэння ў Мінскай губерні, лясной прамысловасці ў Мінскай і Магілёўскай, тэкстыльнай – у Гродзенскай губерні), але роля і ўплыў дваранства на фарміраванне прамысловасці на Беларусі ім і не аналізуюцца, а ў спісе мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў (1860–1900 гг.) не паказаны ўладальнікі[12]. Толькі часткова закра-

наюць праблему асобныя артыкулы А.Л. Кіштымава[13]. Значны інтарэс уяўляе манаграфія В.М. Бусько, прысвечаная развіццю эканамічнай думкі на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.[14]

Заўважым, што сярод прац, прысвечаных даследаванню прамысловага дваранскага прадпрымальніцтва, у беларускай гістарыяграфіі наяўны толькі асобны артыкул А.П. Жытко, а таксама асобны пункт у трэцяй главе яго манаграфіі, дзе якраз аналізуецца гаспадарчая дзейнасць дваранства Беларусі[15]. Аўтар характарызуе дзесяціадсоткавы збор з мясцовага памеснага дваранства як істотны фактар прыгнечання мясцовай гаспадаркі: ён выклікаў скарачэнне малочнага статка ў маёнтках у 2 разы, скарачэнне пасеваў (асабліва траў). Апрача таго, ва ўмовах пасля скасавання прыгону ў лютым 1861 г. памешчыкі Беларусі, дзякуючы працэнтнаму збору, адчувалі вострую патрэбу ў грошах і былі змушаны звярнуцца асабліва да продажу лесу (72,6 % лясоў былі прыватнаўласніцкімі)[16].

Значнае месца займала асвятленне дваранскага прадпрымальніцтва ў працах Л.П. Ліпінскага. Так, ім у другім томе «Гісторыі Беларускай СССР» асаблівая ўвага звернута на рэгіянальныя асаблівасці памешчыцкай гаспадаркі[17]. У іншай жа працы прыводзяцца прыклады памешчыцкай гаспадарчай ініцыятывы на Палессі: вінакурэнне на Беларускім Палессі (у канцы XIX ст. штогод вывозілася да 304 тыс. пудоў спірту), гандлёвае садаводства ў Пінскім, Рэчыцкім, Мазырскім і асабліва Гомельскім паветах (у канцы XIX ст. толькі з Гомельскай воласці штогод вывозілі 91 тыс. пудоў яблык), паспяховае развіццё камерцыйнага памешчыцкага рыбалоўства ў Пінскім павеце[18].

У працы В.П. Панюціча «Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг.» магчымасці развіцця памешчыцкай гаспадаркі ацэньваюцца ў цэлым негатыўна: гэтаму перашкаджала пашыранасць іспольшчыны, пераважная здача маёнткаў і фальваркаў у арэнду. Ураджайнасць на памешчыцкіх землях у 5 заходніх губернях была ўсяго на 12 % вышэй, чым на сялянскіх надзелах, хоць тэхнічны пераварот пачаўся ў памешчыцкай гаспадарцы ў 1860-я гг., а ў сялянскай – толькі ў 1880–1890-я гг.[19] Вынікае, што маёнтак ёсць тормаз развіцця сельскай гаспадаркі, якую рушыў наперад прагрэс сялянскай гаспадаркі[20]. У цэлым на тых жа пазіцыях знаходзіцца і Х.Ю. Бейлькін[21]. Ён, аднак, адзначае пэўны і істотны прагрэс памешчыцкай гаспадаркі ў пачатку XX ст. у зерневай спецыялізацыі, а таксама адносна паспяховае (з'яўленне толькі невялікай колькасці перапрацоўчых прадпрыемстваў) развіццё малочнай гаспадаркі[22].

Падобная сітуацыя (адносна малая выяўленасць праблемы развіцця дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва) характарызуе ў цэлым і ўкраінскую гістарыяграфію (К.Г. Воблы, В.В. Галабуцкі, П.М. Першын, А.А. Несцярэнка, Ф.Е. Лось, В.П. Цяпліцкі, М.А. Рубач, П.В. Свенжынскі, І.І. Кампаніец, М.Н. Лешчанка, І.В. Гуржый, Л.М. Іваноў, Я.М. Гуменюк, П.П. Целічук, Н.Р. Цемірава і інш.). Асобна разглядаюцца рэгіёны Наваросіі (Стэпавы рэгіён, Поўдзень), Левабярэжжа і Правабярэжжа (Паўднёва-Заходні край), аднак Палессе не вылучаецца ў працах гэтых аўтараў як пэўны асаблівы рэгіён.

Так, В.П. Цяпліцкі адметнай асаблівасцю Правабярэжжа лічыць пашыранасць сервітутаў; тады як на Валыні (Валынскае Палессе. – *В. К.*) была надзвычайна пашырана цераспалосіца[23]. У межах Паўднёва-Заходняга краю ім вылучалася Палессе тым, што тут сялянскае льнаводства значна пераўзыходзіла памешчыцкае і былі пашыраны пасевы льну-даўгунцу, чаго не было на ўсёй астатняй Украіне, а таксама тым, што ў краі назіралася мінімальная розніца ва ўраджайнасці збожжавых і бульбы на сялянскіх ды памешчыцкіх палетках (10–15 %)[24]. У той жа час А.А. Несцярэнка, праца якога, прысвечаная гісторыі станаўлення і развіцця прамысловасці, мае надзвычайнае значэнне ва ўкраінскай гістарыяграфіі, адзначае ў канцы XIX ст. на Валыні агульны заняпад практычна ўсіх галін прамысловасці[25].

Л.М. Іваноў вызначаў, што на Валыні была найбольшая колькасць (1905 г.) землеўладальнікаў з болей 10 тыс. дзесяцін – 38, у той час як па ўсёй Украіне такіх было 104[26]. У гэтым дачыненні – выразны латыфундыяльны характар – Валынскае Палессе адпавядала асаблівасцям Беларускага Палесся. Тое ж датычылася і большага памеру сялянскіх надзелаў у рэгіёне. Таксама ўласна Палескі рэгіён не ведаў цукраварнага буму, як на Правабярэжжы, але краю быў уласцівы поспех вінакурнай справы ў маёнтках. Апрача таго, як гэта мела месца ў Паўночна-Заходнім краі, адзначаецца пашыранасць лясных промыслаў. Так, І.В. Гуржый адзначае вялікую ролю ў межах усёй Украіны сплаву лясных матэрыялаў па р. Прыпяць з Пінска і Мазыра, месцам размеркавання якіх служыла мястэчка Чарнобыль[27]. Асаблівасць гэтага краю заўважыў яшчэ ў першай палове XIX ст. назіральны чыноўнік Фундуклей: памешчыкі ў Радамысельскім павеце Кіеўскай губерні досыць часта здавалі ў арэнду сваіх сялян лесапрамыслоўцам на ўвесь лесасплаўны перыяд[28].

У 1990-я гг. сацыяльна-эканамічная праблематыка ў доследах украінскіх гісторыкаў, у адрозненне ад беларускай гістарыяграфіі, была часова забыта.

Аднак у другой палове 1990-х гг. сітуацыя пачала змяняцца. Так, у 1997 г. Л.М. Гарэнка была абаронена кандыдацкая дысертацыя, у якой разглядалася гаспадаранне ў Каменскім маёнтку Давыдавых. Н.Р. Цеміравай у 2003 г. у Данецку была абаронена доктарская дысертацыя і выйшла яе манаграфія «Поміщікі України в 1861–1917 рр.:

соціальна-економічна еволюція». Даказвалася, што памешчыцкая гаспадарка шмат у чым зрабіла пазітыўны ўплыў на сялянскую: пашырэнне палепшанага інвентару і сельскагаспадарчых машын, насення і парод племянной жывёлы[29]. Затым з'явілася праца В.В. Гарбанёва, прысвечаная памешчыцкай гаспадарцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. у Харкаўскай губерні. Аднак менавіта дваранскае прамысловае прадпрымальніцтва па-ранейшаму заставалася практычна па-за ўвагай[30].

[1] Гл.: Список фабрик и заводов России 1910 г.: По официальным данным фабричного податного и горного надзора. СПб., 1910; Указатель фабрик и заводов Европейской России: Материалы для фабрично-заводской статистики. 3-е изд. СПб., 1894; Указатель фабрик и заводов окраин России: Царства Польского, Кавказа, Сибири и среднеазиатских владений: Материалы для фабрично-заводской статистики России. СПб., 1895.

[2] Пешехонов А.В. Земельные нужды деревни и основные задачи аграрной реформы. 3-е изд. СПб., 1906. С. 8.

[3] Гл.: Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии. 1860–1900. Мн., 1978. С. 87.

[4] Гл.: Указатель фабрик и заводов Европейской России… С. 96.

[5] Там жа. С. 518.

[6] Там жа. С. 136, 155; Список фабрик и заводов России... С. 208, 620.

[7] Гл.: Панюціч В.П. Вінакурства Беларусі (60–70-я гады XIX ст.) // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2006. № 4. С. 65.

[8] Гл.: Абезгауз З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX в. Мн., 1971. С. 14.

[9] Гл.: Указатель фабрик и заводов Европейской России… С. 214, 683.

[10] Там жа. С. 342–351; Список фабрик и заводов России… С. 350–351.

[11] Гл.: Абезгауз З.Е. Указ. тв.

[12] Гл.: Болбас М.Ф. Указ. тв. С. 104, 206–308.

[13] Гл.: Киштымов А.Л. Западнополесская династия Скирмунтов // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 23–24 крас. 1998 г. Брэст, 1998. Ч. 2. С. 88–92; Ён жа. Экономический потенциал белорусской усадьбы в конце XVIII – начале XX века // Исторические усадьбы Беларуси: состояние и перспективы: Материалы Междунар. конф., Залесье (Сморгонский р-н), 4–5 сент. 2003 г. Мн., 2003. С. 90–123.

[14] Гл.: Бусько В.Н. Экономическая мысль Белоруссии сер. XIX – нач. XX в. Очерки. Мн., 1990.

[15] Гл.: Жытко А.П. Дваранскае прамысловае прадпрымальніцтва ў Беларусі (1861–1914) // Беларускі гістарычны часопіс. 2003. № 2. С. 10–15; Ён жа. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. Мн., 2003.

[16] Гл.: Жытко А.П. Дваранства Беларусі… С. 149, 151, 188–189.

[17] Гл.: Гісторыя Беларускай ССР. Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.). Мн., 1972. С. 73–86.

[18] Гл.: Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971. С. 50, 79–81, 91–99, 117, 133–142.

[19] Гл.: Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990. С. 130, 170–171, 203–204.

[20] Там жа. С. 357.

[21] Гл.: Бейлькин Х.Ю. Трансформация сельского хозяйства Беларуси в начале XX века (1901–1914 гг.). Гомель, 2006. С. 223–224.

[22] Там жа. С. 131.

[23] Гл.: Теплицький В.П. Реформа 1861 року і аграрні відносини на Україні (60–90-ті рокі XIX ст.). Київ, 1959. С. 111.

[24] Там жа. С. 210, 213, 219–220.

[25] Гл.: Нестеренко О.О. Розвиток промисловості на Україні. Київ, 1962. Ч. II. С. 11.

[26] Гл.: Иванов Л.М. Распределение землевладения на Украине накануне революции 1905–1907 гг. // Исторические записки. М., 1957. Т. 60. С. 176–214.

[27] Гл.: Гуржій І.О. Україна в системі всеросійського ринку 60–90-х років XIX ст. Київ, 1968. С. 110–111.

[28] Гл.: Воблый К.Г. Опыт истории свекло-сахарной промышленности СССР. М., 1928. Т. 1. С. 8.

[29] Гл.: Темірова Н.Р. Соціальна-економічна еволюція поміщицтва України в 1861–1917 рр.: Автореф. дис. … д-ра іст. наук. Донецьк, 2003. С. 26.

[30] Гл.: Павлюк В.В. Магнатерія Волині в умовах розвитку ринкових відносин у другій половині XIX ст. // Український історични журнал. 2000. № 1. С. 102–108.

Паступіў у рэдакцыю 21.03.08.

***Віктар Адамавіч Кахновіч*** – аспірант кафедры гісторыі Расіі. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Расіі А.А. Яноўскі.